Раздзел III.

# ВЫКАРЫСТАННЕ СУЧАСНЫХ МЕТАДАЎ, ФОРМ І ТЭХНАЛОГІЙ У АДУКАЦЫЙНЫМ ПРАЦЭСЕ

Н.Д. Піскун,
прафесар кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін
ДУА «Інстытут культуры Беларусі», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

## Модульная тэхналогія як інавацыя ў сістэме павышэння кваліфікацыі па напрамку «Арт-тэрапія»

Бесперапынная адукацыя як працэс адукацыйнага росту чалавека забяспечвае пастаяннае развіццё яго асобаснага, прафесійнага і творчага патэнцыялу. У цяперашні час усе формы асноўнай адукацыі, дадатковай адукацыі дарослых, самаадукацыі і іншых відаў навучання складаюць сістэму бесперапыннай адукацыі. Згодна з пазіцыяй Міжнароднай камісіі па адукацыі для XXI стагоддзя пры ЮНЕСКА канцэпцыя адукацыі, якая насіла б творчы характар і стала асновай новага мыслення на працягу ўсяго жыцця, набывае ключавое значэнне. На думку камісіі, асноватворнымі задачамі сучаснасці ў галіне палітыкі бесперапыннай адукацыі з'яўляюцца наступныя:

навучыцца набываць веды, улічваючы хуткія змены, звязаныя з навуковым прагрэсам і новымі формамі эканамічнай і сацыяльнай дзейнасці, спалучаючы досыць шырокія агульнакультурныя веды з магчымасцю глыбокага спасціжэння абмежаванай колькасці дысцыплін. Агульны культурны ўзровень разглядаецца як пропуск да бесперапыннай адукацыі, паколькі ён прывівае густ да адукацыі, а таксама з'яўляецца яго асновай, неабходнай для таго, каб вучыцца на працягу ўсяго жыцця;

навучыцца працаваць, удасканальвацца ў сваёй прафесіі, а ў больш шырокім сэнсе — набываць кампетэнтнасць, якая дае магчымасць спраўляцца з рознымі сітуацыямі, многія з якіх немагчыма прадбачыць;

навучыцца жыць. Гэтае пытанне займае цэнтральнае месца ў дакладзе Эдгара Фора, апублікаваным у 1972 г. пад эгідай ЮНЕСКА. Яго рэкамендацыі захоўваюць усю сваю актуальнасць, паколькі XXI ст. патрабуе ад усіх большай самастойнасці і здольнасці да ацэнкі, якія спалучаюцца з узмацненнем асабістай адказнасці ў рамках рэалізацыі калектыўнага праекта. Гэта неабходна ў сувязі з другім важным момантам, падкрэсленым у дакладзе: не пакідаць незапатрабаваным ні адзін

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

з талентаў, што, як скарбы, схаваныя ў кожным чалавеку, такія як памяць, уяўленне, фізічныя магчымасці, эстэтычнае пачуццё, здольнасць да разважання, зносін з іншымі, натуральны аўтарытэт кіраўніка. Усё гэта пацвярджае неабходнасць лепш спазнаць саміх сябе [4].

На вырашэнне гэтых глабальных і вузкапрофільных задач арыентавана модульная адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі па арт-тэрапіі, прапанаваная для асваення кіруючым работнікам і спецыялістам сферы культуры ў Інбелкульце, якая стартавала ў 2014 г. Арт-тэрапія як вобласць навуковых ведаў і практычнай дзейнасці ў Беларусі знаходзіцца на стадыі станаўлення. Нягледзячы на тое, што арт-тэрапеўтычная дзейнасць сёння ў рэспубліцы не носіць арганізаванага і мэтанакіраванага характару, час для яе інтэнсіўнага развіцця надышоў. Адукацыя і кампетэнцыі спецыялістаў, якія займаюцца арт-тэрапеўтычнай дзейнасцю, — адно з самых актуальных пытанняў на сённяшні дзень. Паколькі арт-тэрапія з'яўляецца інтэгратыўнай галіной, яе варта асвойваць у працэсе навучання. Абгрунтаванне прапанаваных высноў прадстаўлена ў шэрагу публікацый [5; 6; 7].

Модульнае навучанне як тэхналогія і форма ДАД бярэ свой пачатак у 60-х гг. XX ст., калі ў каледжах і ўніверсітэтах ЗША была прапанавана новая мадэль адукацыйнага працэсу, якая прадугледжвае дзяленне вучэбнага плана і зместу дысцыпліны на пэўную колькасць частак, т.зв. «модуляў». Высокая выніковасць прымянення модульнай адукацыі прывяла да яе хуткага распаўсюджвання ў адукацыйным асяроддзі. У 1972 г. Сусветная канферэнцыя па асвеце пры ЮНЕСКА рэкамендавала модульную сістэму як найбольш паспяховую для бесперапыннай адукацыі дарослых.

Удасканаленне і рэалізацыя модульнага падыходу ў бесперапыннай адукацыі — праблема, якая прываблівае значную колькасць навукоўцаў, што даследуюць яе ў розных кантэкстах: з пункта гледжання філасофскага асэнсавання; з пазіцый магчымасцей рэалізацыі індывідуальнага падыходу ў модульным навучанні; у ракурсе выяўлення прынцыпаў пабудовы і выкарыстання модульных праграм; у аспекце прымянення модульнага падыходу да падрыхтоўкі розных катэгорый спецыялістаў і інш. Асобную метадалагічную, тэарэтычную і практычную значнасць сёння ўяўляюць даследаванні М.В. Блахіна, М.В. Бардоўскай, К.Я. Вазінай, Т.В. Гуськовай, М.В. Драздовай, Ю.М. Канавалавай, Н.Б. Ларэнцьевай, А.П. Лабанава, А.М. Ляшчанка, А.А. Мураўёвай, А.М. Алейнікавай, В.Г. Праворавай, А.У. Сартаковай, Т.І. Шамавай, П.А. Юцявічэне. Улічваючы, што пытанне змястоўнага раскрыцця паняцця «модуль» мае дастатковую колькасць аўтарскіх інтэрпрэтацый, у якасці рабочай дэфініцыі пры распрацоўцы модульнай праграмы было прынята вызначэнне, згодна з якім модуль — гэта «цэласны набор уменняў, якія падлягаюць асваенню, тэарэтычных і практычных ведаў, адносін і вопыту (г.зн. кампетэнцый), неабходных для выканання канкрэтнай працоўнай функцыі, значнай для сферы працы» [3, с. 245]. У заяўленым кантэксце «вучэбны модуль» разумеецца як «адзінка зместу, якая валодае адноснай самастойнасцю і цэласнасцю на ўзроўні вучэбнага плана або праграмы, вызначае логіку арганізацыі працэсу яго асваення» [9, с. 64]. Згодна з вызначэннем С.М. Вішняковай модульнае навучанне ўяўляе





РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

сабой «тэхналогію навучання, сутнасць якой заключаецца ў тым, каб той, хто навучаецца, мог самастойна працаваць з прапанаванай яму індывідуальнай вучэбнай праграмай, якая ўключае ў сябе банк інфармацыі і метадычнае настаўленне; ставіць сваёй мэтай забеспячэнне гнуткасці, прыстасаванне да індывідуальных патрэб асобы і ўзроўню яе базавай падрыхтоўкі. Пры модульным навучанні педагог выконвае, акрамя інфармуючых і кантралюючых функцый, яшчэ і функцыі кансультанта і каардынатара. Выкарыстанне прынцыпу модульнага навучання на практыцы дазваляе выбудоўваць матэрыял так, каб раздзелы былі незалежнымі адзін ад другога, што дае магчымасць змяняць, дапаўняць і ствараць вучэбны матэрыял, не парушаючы адзінага зместу» [1, с. 173]. У якасці асноўных прынцыпаў распрацоўкі тэхналогіі модульнага навучання ўслед за палажэннямі прафесара В.Г. Праворавай варта згадаць такія, як: модульнасць; дынамічнасць; гібкасць; парытэтнасць; вылучэнне са зместу адасобленых элементаў; дзейснасць і аператыўнасць ведаў; рознабаковасць метадычнага кансультавання; усвядомленая перспектыва [8, с. 20].

З’яўляючыся інавацыйным падыходам у павышэнні кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў у сферы культуры па напрамку арт-тэрапіі, распрацоўка модульнай праграмы (паводле метадалогіі М.В. Бардоўскай [9, с. 65]) уключае ў сябе чатыры этапы:

1) аналіз вучэбнага матэрыялу з пункта гледжання метадычнай мэтазгоднасці яго прадстаўлення ў модульным варыянце;
2) пастаноўка мэт і вызначэнне плануемых вынікаў навучання;
3) распрацоўка дыдактычнага матэрыялу ў выглядзе модуляў, праектаванне дзейнасці педагога;
4) эксперыментальная праверка створанай модульнай праграмы з мэтай удакладнення адпаведнасці рэальных дасягненняў планаваным вынікам і магчымая карэкцыя зместу асобных модуляў.

Праграма павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў у сферы культуры, якія рэалізуюцца ў Інбелкульце, прадугледжвае пяць модуляў. Прафесарска-выкладчыцкі састаў прадстаўлены сертыфікаванымі ў галіне арт-тэрапіі спецыялістамі, дыпламаванымі ў галіне мастацтвазнаўства і псіхалагічных навук. Адукацыйная дзейнасць ажыццяўляецца ў рамках псіхадынамічнай, экзістэнцыяльна-гуманістычнай і педагагічнай мадэляў арт-тэрапіі і пазіцыяніруе інтэграцыйны падыход, які дазваляе вывучыць і выкарыстоўваць у далейшай прафесійнай дзейнасці сінтэтычныя віды арт-тэрапіі. Заняткі праводзяцца ў спецыялізаванай аўдыторыі, якая дазваляе аператыўна трансфармаваць вучэбную прастору, матэрыяльна аснашчаной усім неабходным абсталяваннем і мастацкімі матэрыяламі.

На сённяшні дзень рэалізаваны два модулі адукацыйнай праграмы: «Сучасная арт-тэрапія: падыходы і тэхнікі» і «Сучасныя арт-тэрапеўтычныя падыходы і тэхнікі ў мастацкай адукацыі і культуры».

Змястоўная частка праграмы першага модуля «Сучасная арт-тэрапія: падыходы і тэхнікі» прадстаўлена трыма асноўнымі блокамі. Першы блок прэзентуе асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры, адукацыі і аховы здароўя, яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асноўныя прынцыпы, мэты і прыярытэты. Асаблівая ўвага надаецца актуалізацыі пытання неабходнасці прымянення ў дзейнасці ўстаноў культуры і мастацтва прыёмаў і тэхнік арт-тэрапіі, якія дазваляюць праводзіць эфектыўную прафілактыку псіхасаматычных расстройстваў, карэкціраваць адхіленыя паводзіны, спрыяючы тым самым фарміраванню здаровага ладу жыцця. Другі блок прысвечаны асваенню слухачамі пытанняў методыкі і тэхнікі арт-тэрапеўтычнага працэсу ва ўстановах культуры. Асаблівая ўвага нададзена вывучэнню арт-тэрапеўтычных тэхнік, накіраваных на развіццё групавой згуртаванасці, а таксама дыягнастычнага і карэкцыйнага патэнцыялу выяўленчай тэрапіі і пясочнай тэрапіі. Трэці блок актуалізуе вывучэнне выкарыстання метафарычных асацыятыўных карт у арт-тэрапеўтычным працэсе, што прадугледжвае знаёмства з іх разнавіднасцямі, тэхнікамі і асаблівасцямі прымянення ў індывідуальнай і групавой арт-тэрапіі.

Змястоўная частка праграмы другога модуля «Сучасныя арт-тэрапеўтычныя падыходы і тэхнікі ў мастацкай адукацыі і культуры» прадугледжвае вывучэнне вучэбнага матэрыялу паводле вызначанага часу, абумоўленага ўзроўнем складанасці пытанняў, аб'ёмам матэрыялу, з мэтай найбольш поўнага засваення асноўных тэм, аб'яднаных у тры раздзелы. Змест першага раздзела «Выкарыстанне тэхнік выяўленчай тэрапіі ў групавой і індывідуальнай арт-тэрапеўтычнай дзейнасці» складаюць тэарэтыка-метадалагічныя і практычныя аспекты выкарыстання тэхнік выяўленчай тэрапіі. Другі раздзел «Выкарыстанне карэкцыйных і развіваючых магчымасцей метафары ў арт-тэрапеўтычным працэсе» накіраваны на засваенне слухачамі зместу і методыкі правядзення тэхнік на аснове выкарыстання псіхалагічнага патэнцыялу метафарычных карт і казкатэрапіі. Асаблівая ўвага акцэнтуецца на вывучэнні інтэрмадальных метадаў арт-тэрапіі. Трэці раздзел прысвечаны прымяненню ў арт-тэрапеўтычнай практыцы сучасных дыягнастычных і карэкцыйных магчымасцей тэхнік музычнай тэрапіі.

Прафесійны склад слухачоў, якія праходзяць павышэнне кваліфікацыі па напрамку арт-тэрапіі, разнастайны і дэманструе зацікаўленасць у падобным навучанні спецыялістаў розных напрамкаў дзейнасці ў сферы культуры. Гэта кіраўнікі школ-каледжаў мастацтваў, студый, цэнтраў эстэтычнага выхавання, настаўнікі дзіцячых школ мастацтваў, бібліятэчныя работнікі, навуковыя супрацоўнікі музеяў, арт-дырэктары, выкладчыкі і спецыялісты мастацкіх майстэрняў, студый выяўленчага мастацтва, цэнтраў дзіцячай творчасці, спецыялісты ў галіне PR-тэхналогій.

Ужыванне модульных тэхналогій у адукацыйным працэсе па арт-тэрапіі абумовіла варыятыўнасць прапануемых слухачам праграм і іх практыкаарыентаваную накіраванасць на запыты канкрэтнай групы. Пры падвядзенні вынікаў навучання па кожнаму модулю праводзіцца апытанне слухачоў пасля ацэнкі яго эфектыўнасці, якое дазваляе вывучыць іх патрэбы ў кантэксце далейшага навучання па напрамку арт-тэрапіі. Слухачы сумесна з выкладчыкамі вызначаюць віды арт-тэрапіі, вывучэнне якіх неабходна ў прафесійнай дзейнасці ўдзельнікаў групы. Атрыманыя пры апытанні даныя з'яўляюцца асновай для фарміравання праграмы наступнага модуля.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку асваення модуляў па арт-тэрапіі слухачы вывучаюць метадалогію і тэхнікі розных відаў арт-тэрапіі, што дазваляе ім прымяняць набытыя веды і навыкі ў прафесійнай дзейнасці. Трэнінгавая форма навучання садзейнічае іх асобаснаму росту і развіццю. У міжмодульны час выкладчыкі падтрымліваюць сувязь са слухачамі, аказваюць ім кансультатыўную дапамогу ў кантэксце рэалізуемых арт-тэрапеўтычных праектаў на месцах. Праводзіцца работа па абагульненню матэрыялаў з мэтай стварэння ў далейшым базы даных аб арт-тэрапеўтычнай дзейнасці ў сферы культуры.

Такім чынам, адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, накіраваная на рашэнне шэрага прафесійных задач, з'яўляецца інавацыйнай з пункта гледжання навучання арт-тэрапеўтычнай дзейнасці спецыялістаў устаноў культуры шляхам прымянення модульных тэхналогій. Яе апрабацыя паказала эфектыўнасць выкарыстання модульнага падыходу ў павышэнні кваліфікацыі работнікаў культуры і актуальнасць напрамку «Развіццё арт-тэрапіі ў сферы культуры».

Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Вишнякова, С.М.* Профессиональное образование. Словарь. Ключевые понятия. Термины. Актуальная лексика / С.М. Вишнякова. — М. : НМЦ СПО, 1999. — 538 с.
2. Концепция непрерывного образования в Российской Федерации : цели, особенности правового регулирования и управления / Г.А. Балыхин, Г.К. Сафаралиев, А.П. Бердашкевич // Вестник РГГУ. — 2011. — № 4. — (Сер. «Управление».) — С. 9—28.
3. Модульные технологии : проектирование и разработка образовательных программ : учеб. пособие / О.Н. Олейникова [и др.]. — 2-е изд., перераб. и доп. — М. : Альфа-М: ИНФРА-М, 2010. — 253 с.
4. Образование : сокрытое сокровище (Learning: The Treasure Within) : Основные положения доклада Международной комиссии по образованию для XXI века [Электронный ресурс]. — Издательство ЮНЕСКО, 1996. — Режим доступа : http://www.ifap.ru/library/book201.pdf. — Дата доступа : 9.03.2016.
5. *Пискун, Н.Д.* Теория и практика арт-терапии : методологические основания междисциплинарного подхода / Н.Д. Пискун // Искусство и культура. — 2013. — № 3. — С. 127—134.
6. *Пискун, Н.Д.* Современное состояние теории и практики арт-терапии: содержательный аспект образовательного модуля в учебном процессе повышения квалификации руководящих работников и специалистов сферы культуры и искусства / Н.Д. Пискун // Современные тенденции в дополнительном образовании взрослых : материалы II Междунар. науч.-метод. конф. (Минск, 27—28 нояб. 2014 г.). — Минск : РИВШ, 2014. — С. 122—128.
7. *Пискун, Н.Д.* Перспективные возможности внедрения помогающих арт-технологий в деятельность библиотек / Н.Д. Пискун // Библиотека как феномен культуры: Чтение и информационная культура в современном обществе : материалы III Междунар. конгресса (Минск, 21—22 окт. 2015 г.). — Минск : НББ, 2015. — С. 232—238.
8. *Проворова, О.Г.* Принципы модульного обучения : метод. разработка для преподавателей / О.Г. Проворова; Краснояр. гос. ун-т. — Красноярск, 2006. — 32 с.
9. Современные образовательные технологии : учеб. пособие / Н.В. Бордовская [и др.]; под ред. Н.В. Бордовской. — 3-е изд., стер. — М. : КНОРУС, 2013. — 431 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ